АД РЭДАКТАРА

(Замест уступу)

Бацькаўшчына гэта...

Збіраючыся на чацвёрты З'езд беларусаў свету „Бацькаўшчына", я вяртаўся думкамі да папярэдніх — хацелася ўлавіць характэрную гэтай падзеі эмоцыю. Перад польска-беларускай мяжой усё для мяне стала ясна — у такой ці іншай форме ўсім нам мроілася незалежнасць. Зразу ўспомнілася напісанае на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя эсэ Уладзіміра Арлова „Незалежнасць гэта...". У экстрыме эмацыянальнай напругі Арлоў выявіў спадзяванні наконт нармальнай еўрапейскай беларускай дзяржавы. Што з гэтага атрымалася — усе зараз бачым. Перасякаючы мяжу, неадольна захацелася мне напісаць пра тое, чым для беларуса з суседняй Беласточчыны з'яўляецца ягоная духоўная Бацькаўшчына. І няхай не пакрыўдзіцца Валодзя Арлоў за тое, што ягоны літаратурны тэкст стаўся для мяне публіцыстычнай інспірацыяй...

Бацькаўшчына гэта... калі патэлефануеш у дыпламатычнае прадстаўніцтва Беларусі ў любым кутку свету ды скажаш „Добры дзень", у адказ пачуеш такое ж беларускае, а не „Здравствуйте, слушаю вас". А калі занясеш прашэнне ў візе, то не захвалюешся — дадуць яе табе ці не. Аднаразовую, трохразовую, гадавую — а можа і цалкам адмовяць. Бо калі думаеш па-беларуску, то людзей такіх не надта хоча бачыць твая Бацькаўшчына. І крыўдна, і сорамна, калі з гонарам крочаць цэнтрам беларускай сталіцы псеўдаславянскія вычварэнцы, а табе прадвызначаюць самоту, забыццё, рэзервацыю...

Бацькаўшчына гэта... калі перасякаеш беларускую мяжу і радуешся культурнасці памежнікаў і мытнікаў, а не наколваешся на падазронасць ад кожнага слова на роднай мове. Асабісты вобыск, пераграс кніжак і газет толькі таму, што яны на мове Багдановіча і Купалы. А ўсе памежныя дакументы чытаеш і запаўняеш на „общепонятном". Ды ніхто не пажадае табе шчаслівай пабыўкі...

Бацькаўшчына гэта... калі глядзіш па тэлебачанні перамогу

на міжнародным турніры беларускага спартоўца і ведаеш, што праз хвіліну залунае любы кожнаму беларусу бел-чырвона-белы сцяг, а словы і музыка гімна парадуюць веліччу і гістарычнай годнасцю. І радуешся, што тваю духоўную Бацькаўшчыну ведаюць у свеце, як краіну людзей культуры і навукі, як сярэднееўрапейскую дзяржаву, да якой хочацца прыехаць, а не як найхутчэй з'ехаць. Краіну гаспадароў і справядлівасці, якую паказваюць у свеце як каштоўнасць усяе нацыі, а не ўласнасць аднаго чалавека...

Бацькаўшчына гэта... калі шпацыруеш вуліцамі беларускага горада ці мястэчка ды іхнія назвы сваёй мінуўшчынай блізкія твайму сэрцу, а не колюць у вочы прозвішчамі катаў, якія ўчынялі над нашымі продкамі злачынствы генацыду. І не трэба табе баяцца, што аштрафуюць толькі за тое, што на тваім касцюме значок з Пагоняй. І ведаеш, што не пасаромеецца за цябе Францішак Скарына, ордэны якога зараз прысвойваюць самым ярым ворагам беларускасці, а шыльды з ягоным імем выкідаюць у сметніцу...

Бацькаўшчына гэта... калі пойдзеш у турысцкую вандроўку па Беларусі, і не пабаішся, што на кожным кроку захоча цябе абдурыць таксіст, афіцыянт, адміністратар гасцініцы ці аўтазапраўшчык. А калі захочаш пабыць на сваёй Бацькаўшчыне больш за тры дні, дык не будзеш думаць пра штраф з-за неаформленай прапіскі. А за начлег у гатэлі з чыстай ваннай і туалетнай паперай заплаціш па адным для ўсіх тарыфе, а не ў пяць разоў, па замежным...

Бацькаўшчына гэта... краіна, у якой мае сябры і знаёмыя могуць пахваліцца: гэта мой бізнес, гэта пабудова дому для маёй сям'і, гэта мае дзеці, якія прыйшлі з беларускага канцэрта, на якім не адсеклі электратоку і не назвалі іх злоснымі хуліганамі толькі за тое, што слухалі сваіх рытмаў. Краіна, у якой мае сябры і надалей будуць праводзіць дабрачынныя акцыі, але дзеля вырашэння сацыяльных праблем, а не збору сродкаў на штрафы за беларускасць супольнай усім нам Бацькаўшчыны.

Яўген Вапа

„Ніва" н-р 30 (2567) ад 24 ліпеня 2005 г.